3.


**МІНІСТЭРСТВА ЮСТЫЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Мінск, Калектарная, 10.
Тэл. 220-86-87, факс 220-96-84

**МИНИСТЕРСТВО ЮСТИЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Минск, Коллекторная, 10.
Тел. 220-86-87, факс 220-96-84


24.11.2004 № 06-04/1089

На №

Вх. N 8

Дырэкцыя
Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў"

вул.Заводская, 4,
222750, г.Фаніпаль,
Дзяржынскі раён,
Мінская вобл.

Пісьмовае папярэджанне

Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь лістом яшчэ ад 20.09.2004 №06-04/887 запрасіла ў Дырэкцыі Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання "Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў" (далей – РГА "НІСЭПД") копію адной з запоўненых анкет гэтай арганізацыі, аб якой сказана ў яе лісце ад 16.09.2004 №1/09-04. Але РГА "НІСЭПД" пісьмова адмовілася задаволіць гэтую законную прапанову рэгіструючага органа (ліст ад 27.09.2004 №2/09-04).

Такім чынам, РГА "НІСЭПД" стварыла Мінюсту перашкоды ў ажыццяўленні ім дзейнасці, прадугледжанай арт.25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях".

Рэгіструючы орган лістом ад 13.10.2004 №06-04/971 нагадаў арганізацыі аб учыненні ёю названых перашкодаў, адначасова выказаўшы спадзяванне, што пасля размовы, якая адбылася па ініцыятыве Мінюста ў прадстаўніка РГА "НІСЭПД" з Міністрам юстыцыі Рэспублікі Беларусь 11.10.2004, арганізацыя вернецца ў прававое поле. Тым не менш, запрошанае так і не паступіла да сённяшняга дня. Больш за тое, РГА "НІСЭПД" у чарговы раз прадэманстравала сваім лістом ад 26.10.2004 №2/10-04 нежаданне гэта рабіць. Гэта значыць, што РГА "НІСЭПД" зноў стварыла Мінюсту перашкоды ў ажыццяўленні ім дзейнасці, прадугледжанай арт.25 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях".

З улікам выкладзенага, кіруючыся артыкуламі 26, 27, 28 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", Мінюст выносіць Дырэкцыі РГА "НІСЭПД" пісьмовае папярэджанне.

Аб устараненні азначаных парушэнняў і выпрацаваных мерах па недапушчэнню іх у далейшым прапануем паведаміць рэгіструючаму органу ў двухтыднёвы тэрмін з дасланнем адпаведнага пратакола пасяджэння кіруючага органа.

Дадзенае пісьмовае папярэджанне можа быць абскарджана ў Вярхоўны Суд Рэспублікі Беларусь на працягу месяца.

Намеснік Міністра В.В.Міцкевіч

06 Харытон 223 27 93
24.11.2004 п.п./РГА НІСЭПД.doc